Качан Я. Кірылавы "універсітэты": Памяці К.Мазурава// Рэспубліка.- 1996.-13,17,18 крас.(N92,93-94,95).- АННОТАЦИЯ: Старонкі біяграфіі

# У красавіку яму споўнілася б 82 гады.




*Успамінаецца дзень, калі грамадскасць Мінска адзначыла яго 80-годдзе. Прасторная зала Дома ветэрана была заполнена людзьмі 3 партрэта, размешчанага на сцэне, як жывы, глядзеў Кірыл Мазураў. 3 успамінамі выступалі яго старыя сябры, партызаны і падпольшчыкі Анатоль Андрэеў, Траф.м Стрыжак, Яўген Гардзей, кампазітар Ігар Лучанок, удава Мазурава Яніна Станіславаўна... 3 сардэчнай цеплынёй і любоую яны гаварылі пра гэтага цудоўнага чалавека, пра яго рэдкія якасці, пра след, які ён пакінуў пасля сябе. У канкрэтных справах, у душах людзеи. '*

*Я сядзеў у зале, слухаў прамоўцаў і ў думках аддаваўся ўласным успамінам аб Кірылу Трафімавічу, якога таксама ведаў, сустракаўся з Ім і працаваў у яго падначаленні.*

**Адкуль сцяжынка павяла ў свет...**

Дзіцячыя гады яго прайшлі ў вёсцы Рудня-Прыбыткоўская, што раскінулася ўздоўж высокага берага невялікай ракі Уць, паблізу Гомеля. Тут зямля не песціла чалавека. Яе і мала было, і ўрадлівасцю яна не вызначалася. Пра такую зямлю Максім Танк пісаў, што калі па ёй паедзеце, "пярэднія колы могуць захлынуцца балотам, заднія папярхнуцца пяском".

У сям'і бацькі Трафіма Іванавіча і маці Агаф'і Акімаўны было дзве дзяўчынкі і чатыры хлопцы, з якіх Кірыл самы маладзейшы. Жылі беднавата, у дзяцінстве зведаў і нястачы, і нішчымніцу. І ўсё ж нядоўгае знаходжанне ў вёсцы засталося ў яго памяці як "лепшы перыяд жыцця".

Кірыла ўзяў у сваю сям'ю дзядзька Радзівон, які жыў у Гомелі і працаваў на паравозарамонтным заводзе. Хлопчык скончыў 8 класаў чыгуначнай школы і паступіў у аўтадарожны тэхнікум, дзе рыхтаваліся тэхнікі-будаўнікі дарог і мастоў. У гады вучобы пасля кожнага курса праходзіў практыку: працаваў на будаўніцтве жалезабетоннага моста праз Дняпро ў Рэчыцы, на будоўлях у Гомелі, у сістэме "Ппрадора" па разведванню шляхоў зносін і іх праектаванню. Практыка замацоўвала атрыманыя веды ў галіне геадэзіі.

"Мы раслі, прыгадваў пазней Кірыл Трафімавіч, у суровы час, зазналі немалыя цяжкасці і нягоды. Навучаючыся ў школе і тэхнікуме, я падзарабляў на жыццё - разгружаў вагоны, насіў цэглу на будоўлі. Але, жывучы і працуючы ў такіх умовах, мы не былі абмежаванымі людзьмі, панурымі аскетамі". Побач з набыццём прафесійных ведаў паступова складваўся светапогляд, больш зразумелымі станавіліся законы і працэсы грамадскага развіцця.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сапраўдным "універсітэтам" для Мазурава з'явіўся камсамол, у рады якога ён уступіў у 15-гадовым узросце. Актыўны ўдзел у маладзёжным руху, у грамадскай рабоце садзейнічаў фарміраванню арганізатарскіх здольнасцей, росту самасвядомасці, выпрацоўцы грамадзянскіх прынцыпаў і маральных норм.

3 атрыманнем спецыяльнасці Кірыла Трафімавіча накіравалі дарожным тэхнікам у Парыцкі раён, а праз паўгода перавялі ў Камарын на пасаду начальніка райдараддзела, дзе ён займаўся дарожнымі справамі на працягу трох гадоў.

Група спецыялістаўдарожнікаў па камандзіраванню Талоўдарбуда" рэспублікі ездзіла ў Маскву на ўзтзядзенне метрапалітэна. У яе складзе быў і Кірыл Трафімавіч. Сумесна з таварышамі ён удзельнічаў у пракладцы станцый Кіеўскага радыуса, асваенні тунельных работ, іх праектаванні і ажыццяўленні, ва ўдасканаленні і прымяненні геадэзічных прылад і інструментаў. Даводзілася працаваць і каля пад'ёмных механізмаў, брацца за адбойны малаток.

Выкарыстоўвалі кожную вольную ад працы гадзіну, каб пазнаёміцца з Масквой, з яе культурным багаццем. Арганізоўвалі экскурсіі ў Крэмль, Вялікі тэатр, Траццякоўку, гістарычны музей, на буйнейшыя заводы. Праз некалькі месяцаў, калі задание выканалі, беларускія спецыялісты вярнуліся на ранейшыя месцы працы.

У армію Кірыла прызвалі восенню 1936 года. Трапіў у Віцебск, у 5-ы чыгуначны полк. Там ён сустрэў аднаго салдата — жвавага, энергічнага, кампанейскага. Невысокага росту, чарнявы, ён хутка рэагаваў на падзеі, за словам у кішэню, як кажуць, не лез. А што да пісьменнасці, то многім мог даць некалькі ачкоў наперад. Меў добрую падрыхтоўку, лічыўся выдатнікам палітвучобы, адначасова займаўся ў Магілёўскім педінстытуце.

Гэта быў Міхаіл Зімянін. Іх зблізіла праца ў камсамольскім бюро, куды абодва ўваходзілі. Зімянін быў рэдактарам палкавой газеты, у выпуску якой яму дапамагаў Мазураў. Менавіта яна, палкавая газетаі, дала ім пачатковую журналісцкую практыку.

Звольнены ў запас, Кірыл вярнууся ў Гомель, уладкаваўся на працу ў палітаддзел Беларускай чыгункі. Неўзабаве яго перавялі ў абком камсамола — загадчыкам ваенна-фізкультурнага аддзела. У гэтай ролі ён трапіў у Маскву на камсамольскі збор пры Ваенна-палітычнай акадэміі. Прадстаўнікі саюзных рэспублік і расійскіх абласцей вывучалі асновы тактыкі і матэрыяльную частку зброі, праводзілі стралковыя і спартыўныя занята. Слухачы збора разумелі: гэта не выпадкова трэба трымаць порах сухім.

Вясной 1940 года Мазурава абралі сакратаром Гомельскага гаркома камсамола. А восенню таго ж года ён стаў першым сакратаром Брэсцкага абкома камсамола. То была перадчавальнічная пара. Ужо тады зялёны, чысты Брэст ператвараўся ў прыфрантавы

горад. У ім размяшчаліся штаб 4-й арміі і камандаванне 17-га пагранічнага атрада, вуліцы перапаўняліся вайскоўцамі. Кірыл Трафімавіч жыў побач з начальнікам пагранатрада і ад яго ведаў пра напружанасць на дзяржаўнай граніцы, пра частыя парушэнні яе немцамі.

Аднойчы пазваніў Зімянін, ён ужо ўзначальваў беларускую камсамольскую арганізацыю. Папрасіў склікаць сход абласнога актыву камсамола. Зімянін паслухаў інфармацыю з месц, пацікавіўся настроем моладзі ў гарадах і вёсках, звярнуў увагу прысутных на неабходнасць узмацнення яе ваеннапат рыятычнага выхавання, на ўсямернае павышэнне пільнасці і дысцыпліны.

— Такую работу мы вядзём, — дакладваў Мазураў. — Выслухоўваем і пярэчанні. Кажуць: не нагнятайце становішча. Спасылаюцца на паведамленне ТАСС ад 14 чэрвеня 1941 года, дзе сказана аб беспадстаўнасці чутак пра магчымы напад Германіі на СССР. Людзі, безумоўна, і заспакойваюцца, прытупляюць пільнасць.

— Згодзен, гэта перашкаджае выхаваўчай рабоце, — падзяліў думку Зімянін. - Але вярхам відней.

— Атрымліваецца, вярхі не бачаць, што адбываецца тут, на граніцы.

— Бачаць, праяўляюць цярплівасць, — Міхаіл Васільевіч загадкава ўзняў палец. Вялікая палітыка...

Нядоўга давялося Мазураву папрацаваць на Брэстчыне ў мірных умовах. 22 чэрвеня 41-га ўсё трагічна абарвалася, крута змянілася. Над Брэстам заблісkалі злавесныя барвовыя маланкі. Наваколле аглушылася выбухамі бомбаў і снарадаў. Запалалі пажары...

**Франтавыя выпрабаванні**

У канцы жніўня, пасля акупацыі ворагам тэрыторыі рэспублікі, група партыйных і камсамольскіх работнікаў накіравалася ў дзеючую армію, на Паўднёва-Заходні фронт. У ёй быў і Кірыл Трафімавіч.

Прыбылі ў раён Чарнігава (Украіна), у штаб 21-й арміі, якая адступала пад напорам танкаў Гудэрыяна. Начальнік палітаддзела Грынько кінуў на Мазурава стомлены позірк:

— Будзеш інструктарам палітаддзела арміі. Адразу — за справу! Неадкладна выязджай у 89-ю дывізію, там некалькі дзён вядуцца абарончыя баі. Будзеш дапамагаць салдатам, падтрымліваць іх баявы дух.

К прыезду Мазурава ў часць становішча рэзка пагоршылася. Групоўка нашых войск, якая абараняла.Кіеў, і 21-я армія, у тым ліку 89-я дывізія, апынуліся ў акружэнні. Выхад адзін — прабівацца на ўсход.

Выходзілі з акружэння з баямі. За некалькі дзён страцілі тысячы салдат і афіцэраў. Палітруку роты Мазураву давялося замяніць камандзіраў і роты, і батальёна, якія загінулі ў сутычках з немцамі. Сам атрымаў два раненні і кантузію. Некалькі тыдняў лячыўся ў шпіталі.

Услед за разгромам немцаў пад Масквой у Горкім былі адкрыты Вышэйшыя курсы каманднага саставу Чырвонай Арміі "Выстрал".- На іх пасылаліся камандзіры, якія мелі



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы